(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры

УДК 378.147.036:316.7+374.71

Грыгаровіч Ядвіга Дамінікаўна

# ФАРМІРАВАННЕ ЭСТЭТЫЧНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПРАФЕСІЙНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

13.00.05 — тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці
13.00.08 — тэорыя і методыка прафесійнай адукацыі

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара педагагічных навук

Мінск 2002

Работа выканана на кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

Афіцыйныя апаненты — доктар педагагічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута дадатковай адукацыі пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў В.С.Садоўская

— доктар педагагічных навук, прафесар кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта І.І.Казімірская

— доктар псіхалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі, загадчык кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка Я.Л.Каламінскі

Апаніруючая арганізацыя — Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт

Абарона адбудзецца 23 мая 2002 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.03 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры па адрасе: 220001, г.Мінск, вул.Рабкораўская, 17, аўд. 231.
Тэл. вучонага сакратара — 222-83-59.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

Аўтарэферат разасланы 22 красавіка 2002 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый кандыдат педагагічных навук, дацэнт Л.І.Казлоўская

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Гістарычныя пераўтварэнні, сацыяльныя, экалагічныя і тэхнагенныя ўзрушэнні выклікалі адчувальныя змены не толькі ў палітычных, сацыяльна-эканамічных і іншых сферах жыццядзейнасці, але і ў разуменні прыярытэту асобы, яе самакаштоўнасці як творцы паступальнага развіцця чалавецтва. Гэта, магчыма, самы важны вынік XX ст. — часу найскладанейшых выпрабаванняў рэвалюцыямі, войнамі, генацыдам, сацыяльнымі катаклізмамі, экалагічнымі трагедыямі.

Пабудова глабальнай інфармацыйнай цывілізацыі XXI ст. з узаемазвязанай і ўзаемазалежнай эканомікай розных краін, высокаразвітым дэмакратычным укладам магчыма пры ўмове апоры грамадства на адукаванага, прафесійна дасканалага, сацыяльна актыўнага, прынцыпова маральнага чалавека, здольнага да прыняцця нестандартных рашэнняў, хуткага выбару аптымальных шляхоў пошуку патрэбнай інфармацыі, выкарыстання яе на карысць чалавека.

Асабліва важным падаецца развіццё гэтых якасцей у студэнтаў, якія рыхтуюцца да прафесійнай сацыякультурнай дзейнасці, сутнасць якой — стварэнне ўмоў для матываванага выбару чалавекам прадметнай дзейнасці ў вольны час, задавальненне яго рэкрэацыйных і прафесійных патрэбнасцей і інтарэсаў, садзейнічанне самаразвіццю і самарэалізацыі асобы.

Спроба вызначыць найбольш істотную інтэгруючую характарыстыку асобы будучага арганізатара сацыякультурнай дзейнасці, выхаваўчае ўздзеянне на якую дало б станоўчыя зрухі ва ўсёй псіхічнай структуры чалавека і абумовіла б якасць і эфектыўнасць прафесійнай дзейнасці, прывяла да вываду, што вядучым, сістэмаўтваральным фактарам прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы культуры і мастацтва, важнейшай псіхалагічнай уласцівасцю культработніка, якая вызначае не толькі паспяховасць яго дзейнасці, але і пазітыўныя адносіны да людзей, навакольнага асяроддзя, працы і інш., з'яўляецца эстэтычная накіраванасць асобы. Менавіта яна абумоўлівае матывы, мэты, імкненні, жаданні чалавека і вызначае яго дзейнасць па рэалізацыі прафесійных запатрабаванняў і жыццёвых задач, прафесійнае развіццё асобы ў постдыпломны перыяд, валявыя намаганні па ўдасканаленні якасці выконваемай працы.

Такім чынам, актуальнасць тэмы абумоўлена вызначальнай роляй эстэтычнай накіраванасці асобы ў прафесійным станаўленні спецыяліста ў сферы культуры, неабходнасцю яе фарміравання ў працэсе падрыхтоўкі студэнта да сацыякультурнай дзейнасці.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.**

Даследаванне праводзілася ў рамках наступных навуковых праграм і тэм.

1. Дзяржаўная навукова-тэхнічная праграма "Навукова-метадычныя асновы нацыянальна-культурнага развіцця ва ўмовах дэмакратычнай прававой дзяржавы". Зацверджана Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь 21.04.1997 г. (№ 379), 1997—1999 гг. Навуковы кіраўнік і сааўтар раздзела "Падрыхтоўка кадраў культуры для работы ў новых сацыяльна-эканамічных умовах".

2. Галіновая навукова-тэхнічная праграма "Культура", раздзел "Сучасная мадэль культуралагічнай адукацыі: змест, бесперапыннасць, пераемнасць (школа мастацтваў — вучылішча мастацтваў — універсітэт культуры)", 1999—2000 гг. Член аўтарскага калектыву.

3. Рэспубліканская навукова-даследчая праграма "Сістэма гуманітарызацыі адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь: канцэптуальныя асновы стратэгіі, узроўні, кіраванне, каардынацыя і ўкараненне", 1996—1998 гг. Аўтар раздзела "Структура і змест культуралагічнай адукацыі".

4. Комплексная тэма Мінскага інстытута культуры "Прафесійнае станаўленне спецыялістаў культурна-асветніцкай работы", 1985—1990 гг. Аўтар раздзела "Аналіз узроўняў развіцця мастацкіх інтарэсаў студэнтаў".

5. Комплексная тэма Беларускага універсітэта культуры "Навукова-метадычныя аспекты падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў у ВНУ культуры", 1991—1994 гг. Кіраўнік і сааўтар.

**Мэта і задачы даследавання.**

Мэтай дысертацыйнага даследавання з'яўляецца распрацоўка тэарэтычных асноў фарміравання эстэтычнай накіраванасці асобы студэнта вышэйшай навучальнай установы культуры і мастацтваў, шляхоў і сродкаў іх рэалізацыі ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі да арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці насельніцтва.

Мэта абумовіла пастаноўку наступных задач даследавання:

— вызначыць паняцце накіраванасці як сістэмаўтваральнай уласцівасці асобы студэнта, яе аб'ём, структуру і тыпалогію па прадметна-змястоўных прыметах;

— раскрыць сутнасць і месца эстэтычнай накіраванасці ў сістэме іншых якасцей асобы, крытэрыі, параметры і ўзроўні яе развіцця, вызначыць вядучыя матывы выбару прафесійнай эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці;

— даць азначэнне сацыякультурнай дзейнасці як самастойнай падсістэмы сацыялізацыі асобы, раскрыць яе сутнасць, структуру і асноўныя функцыі;

— распрацаваць методыку дыягностыкі эстэтычнай накіраванасці асобы, правесці даследаванне матывацыі прафесійнай дзейнасці ў сферы

культуры, вызначыць узровень эстэтычнай накіраванасці студэнтаў культуралагічных і мастацкіх спецыяльнасцей;

— выявіць сутнасць і ролю эстэтычных інтарэсаў як формаў праяўлення і сродкаў фарміравання эстэтычнай накіраванасці асобы, змест, узроўні і ўмовы іх развіцця ў студэнтаў вышэйшых навучальных установаў культуры і мастацтваў;

— распрацаваць гіпатэтычную мадэль эстэтыка-выхаваўчага кампанента прафесійнай дзейнасці будучых арганізатараў вольнага часу, педагагічныя ўмовы яе рэалізацыі ў працэсе навучання студэнтаў;

— вызначыць асноўныя прынцыпы пабудовы зместу сацыякультурнай адукацыі на падставе іерархічнай структуры культуры, шляхі і сродкі эстэтызацыі працэсу навучання;

— выявіць арганізацыйна-педагагічныя кірункі фарміравання эстэтычнай накіраванасці студэнтаў у вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтваў.

**Аб'ект і прадмет даследавання.**

Аб'ект даследавання — эстэтычная накіраванасць асобы студэнта вышэйшай навучальнай установы культуры і мастацтваў як сістэмаўтваральная, прафесійна вызначальная якасць будучага арганізатара сацыякультурнай дзейнасці.

Прадмет даследавання — умовы, шляхі і сродкі фарміравання эстэтычнай накіраванасці асобы студэнта ў працэсе падрыхтоўкі да прафесійнай дзейнасці ў сферы культуры.

**Гіпотэза.**

Эстэтычная накіраванасць з'яўляецца найбольш важнай, істотнай, сістэмаўтваральнай якасцю, якая вызначае інтарэсы і патрэбнасці, густы і ідэалы, сістэму каштоўнасных арыентацый, светапогляд, эфектыўнасць дзейнасці і актыўнасць асобы. Сфарміраванасць эстэтычнай накіраванасці студэнтаў з'яўляецца неабходнай умовай прафесійнага станаўлення спецыяліста і якаснага выканання ім будучай прафесійнай дзейнасці. Станаўленне эстэтычнай накіраванасці патрабуе разумнага, паступовага выхавання складаных матывацыйных комплексаў сацыяльнага, альтруістычнага, камунікатыўнага і асобаснага зместу, якія вызначаюць жаданне і імкненне студэнта займацца сацыякультурнай дзейнасцю.

Выхаванне матывацыйных комплексаў магчыма не толькі пры ўмове прафесійна арыентаванай структуры, зместу, формаў і метадаў культуралагічнай адукацыі, выбару адэкватных сучасных тэхналогій навучання, але і пры арганізацыі пастаяннай эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці студэнтаў на працягу ўсіх гадоў навучання, у працэсе якой увага педагогаў, акрамя вырашэння дыдактычных задач, канцэнтруецца на фарміраванні важнейшага кампанента будучай прафесійнай дзейнасці — эстэ-

тыка-выхаваўчай, якi складаецца з крэатыўнасцi, эмпатыi, эстэтычнага тэзаўруса, педагагiчнага артыстызму асобы.

Крэатыўнасць як сукупнасць разумовых i эмацыянальных якасцей, што садзейнiчаюць станаўленню i праяўленню творчых магчымасцей асобы (творчы патэнцыял), забяспечваецца высокiм узроўнем працэсу навучання, актыўнай пазааўдыторнай сацыякультурнай дзейнасцю пад непасрэдным цi апасродкаваным кiраўнiцтвам педагога, разгалiнаванай мастацкай i творчай дзейнасцю ў вольны час.

Выхаванасць эмпатыi дасягаецца разуменнем прыярытэту i самакаштоўнасцi кожнага чалавека, здольнасцю паставiць сябе на месца аб'екта ўздзеянняў i знайсцi прымальны для выхаванца выхад з хвалюючай яго сiтуацыi, пастаянным улiкам iндывiдуальных асаблiвасцей, патрэбнасцей i iнтарэсаў асобы пры арганiзацыi любога мерапрыемства i ў мэтанакiраваных гуманiстычных стасунках, суперажываннем эмацыянальнаму стану iншага чалавека i ўменнем адгукнуцца на яго.

Тэзаўрус набываецца дзякуючы эстэтычнай адукацыi, якая ўяўляе сiстэму навуковых ведаў у галiне эстэтыкi, разнастайных вiдаў мастацтва i эстэтычнага ў навакольным асяроддзi, працы, адносiнах людзей. Ён забяспечваецца трывалым засваеннем студэнтам таго комплексу эстэтычных ведаў, уменняў, навыкаў, якi садзейнiчае паспяховасцi эстэтыка-выхаваўчай дзейнасцi, накiраванай на рэалiзацыю сацыякультурных праектаў.

Педагагiчны артыстызм як фактар фармiравання эстэтычнай накiраванасцi i як асобасная дыспазiцыйная ўстаноўка на рэалiзацыю працэсу педагагiчнай дзейнасцi эстэтычнымi сродкамi прадвызначаецца эстэтычнымi паводзiнамi, педагагiчна мэтазгоднымi эмоцыямi, iдэнтычнасцю асобасных i прафесiйных мэт педагога, эстэтычнай камунiкатыўнай дзейнасцю, эстэтычна багатай мовай, педагагiчна апраўданай мiмiкай, адэкватнасцю знешнiх функцыянальных паводзiнскiх выяўленняў унутранаму эмацыянальнаму стану, механiзмам самарэгуляцыi як спецыфiчным элементам сiстэмы падрыхтоўкi педагога сацыякультурнай дзейнасцi.

Выхаванне гэтых якасцей патрабуе перабудовы структуры сацыякультурнай адукацыi адпаведна iерархii самой культуры, эстэтызацыi ўсяго працэсу навучання: зместу, формаў, метадаў вучэбнай, мастацкай, самастойнай дзейнасцi студэнтаў.

**Метадалогiя i метады праведзенага даследавання.**

Метадалагiчная аснова даследавання будавалася на сiнтэзе фiласофска-культуралагiчных (М.А.Арыярскi, М.Вебер, Б.С.Ерасаў, С.М.Iконнiкава, М.С.Каган, М.I.Крукоўскi, Э.В.Сакалоў, Л.Уайт, А.Я.Флiер i iнш.), псiхалагiчных (В.В.Давыдаў, А.М.Лявонцьеў, С.Л.Рубiнштэйн, Д.Б.Элькошн) i педагагiчных (Ю.К.Бабанскi, Б.С.Гершунскi, Л.В.Занкоў, Б.П.Есiпаў, У.С.Iльiн, Б.Ц.Лiхачоў, М.М.Скаткiн, I.Ф.Харламаў, Г.I.Шчукiна) канцэпцый развiцця асобы чалавека. Тэарэтычнымi пад-

ставамі даследавання сталі працы псіхолагаў па праблемах асобы, яе дзейнасці і стасункаў, актыўнай прыроды псіхікі чалавека (Б.Г.Ананьеў, К.А.Абульханава-Слаўская, А.Р.Асмолаў, А.А.Бадалёў, Л.І.Бажовіч, Я.Л.Каламінскі, Б.Ф.Ломаў, А.У.Пятроўскі, Б.М.Цяплоў), канцэпцыя адносін асобы, сфармуляваная ўпершыню А.Ф.Лазурскім і ўсебакова распрацаваная У.М.Мясішчавым, культурна-гістарычная канцэпцыя развіцця вышэйшых псіхічных функцый Л.С.Выгоцкага, а таксама тэорыя сацыякультурнай дэтэрмінацыі пераўтваральнай дзейнасці і адукацыі.

Асновай распрацоўкі тэарэтычных аспектаў фарміравання эстэтычнай накіраванасці стаў дзейнасны падыход як прынцып вывучэння псіхікі (М.Я.Басаў, А.М.Лявонцьеў, С.Л.Рубінштэйн, А.А.Смірнова, Б.М.Цяплоў і іх вучні), у прыватнасці ўяўленне аб вядучай дзейнасці як аснове і рухаючай сіле развіцця псіхікі ў антагенезе і аб іерархіі матываў і асобасных сэнсаў як адзінак будовы асобы.

Агульнанавуковы ўзровень метадалогіі прадстаўлены сістэмным падыходам, які забяспечвае цэласнае ўяўленне аб любой з'яве, што праходзіць праз пэўныя этапы свайго развіцця ад узнікнення да сфарміраванасці (Ю.К.Бабанскі, З.І.Васільева, Т.А.Ільіна, Ф.Ф.Каралёў, Н.В.Кузьміна, Л.І.Новікава, П.І.Підкасісты, Л.М.Панчэшнікава, В.А.Сласцёнін і інш.).

Важнае метадалагічнае значэнне ў даследаванні шляхоў фарміравання накіраванасці мелі канцэпцыі эстэтычнага ўспрымання мастацтва і развіцця эстэтычных адносін чалавека да навакольнай рэчаіснасці (Л.В.Благанадзёжына, А.І.Бураў, І.І.Далецкая, М.С.Каган, Я.В.Квяткоўскі, Б.Ц.Ліхачоў, А.А.Лявонцьеў, М.С.Лейтэс, Б.С.Мейлах, Н.Д.Малдаўская, В.М.Нікіфарава, В.А.Салееў, П.В.Сіманаў, М.Н.Шчыракоў, П.М.Якабсон).

Прадстаўленая дысертацыйная работа з'яўляецца абагульненнем трыццацігадовых тэарэтычных і эксперыментальных даследаванняў аўтарам працэсу эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення і шляхоў фарміравання адносін асобы да эстэтычных аб'ектаў і з'яў рэчаіснасці — інтарэсаў, патрэбнасцей, матываў і як вынік — накіраванасці, якая вызначае функцыянальныя магчымасці чалавека ў арганізацыі і ажыццяўленні эстэтычнай дзейнасці. Гэта абумовіла шырокае прымяненне разнастайных традыцыйных, адаптаваных да мэт даследавання і спецыяльна распрацаваных метадаў і прыёмаў, што мелі ўзаемадапаўняльны і ўзаемаправерачны характар.

Арганізацыя і методыка даследавання будаваліся на сістэмным аналізе сацыяльна-культурных з'яў і працэсаў, на выкарыстанні сукупнасці метадаў параўнальна-гістарычнага, культуралагічнага, мастацтвазнаўчага, сацыялагічнага, псіхалагічнага і педагагічнага аналізу, розных мадыфікацый назірання, шматлікіх тыпаў апытання — анкетаванне, тэсціраванне, інтэрв'юіраванне, гутарка, метады ўзаемных характарыстык, экспертных ацэнак, незакончаных сказаў, асацыятыўных радоў, літаратур-

ных, тэатральных і ролевых гульняў, педагагічных сітуацый і эцюдаў (па методыках С.Гіпіус і Дж. Радары). Намі выкарыстаны таксама групы метадаў вывучэння педагагічнага вопыту, дакументацыі, вынікаў творчай дзейнасці педагогаў і навучэнцаў, аб'ектыўных матэрыялаў прафесійнай і грамадскай экспертызы, методыкі выяўлення асабістых якасцей (У.С.Аванесаў, С.А.Будасі, Б.І.Дадонаў, К.Роджэрс, Г.Роршах і інш.), праектыўныя методыкі, мадэляванне, якасны і колькасны аналіз атрыманых вынікаў.

Даследаванне матывацыі сацыякультурнай дзейнасці, узроўняў развіцця эстэтычнай накіраванасці асобы студэнта, формаў і спосабаў яе праяўлення ў вучэбнай, самастойнай, творчай і мастацкай дзейнасці, шляхоў і сродкаў яе фарміравання ва ўмовах вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтваў праводзілася ў працэсе эксперыментальнай работы (канстатуючы, пошукавы, фарміруючы эксперыменты, вопытна-эксперыментальная работа) на розных факультэтах Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, Беларускай акадэміі мастацтваў, на музычна-педагагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка ў 1984—1990 гг., паўторна ў 1993—1999 гг. Паўтарэннеэксперыментальнай работы звязана не толькі з пошукам аптымальнай мадэлі сацыякультурнай адукацыі, але і са змяненнем агульнай сітуацыі ў краіне.

Даставернасць і дакладнасць даных забяспечваліся спалучэннем розных тыпаў метадаў пры даследаванні аднаго аб'екта, выкарыстаннем узаемаправяраючых метадаў, неаднаразовым паўтарэннем асобных блокаў даследавання ў розныя гады і з рознымі катэгорыямі падыспытных, суаднесенасцю выкарыстаных метадаў з мэтай, задачамі і прадметам даследавання.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.**

1. Удакладнена тыпалогія накіраванасці асобы па змястоўна-прадметных прыметах, сфармулявана сутнасць паняцця "эстэтычная накіраванасць", раскрыты сувязь эстэтычнай накіраванасці з іншымі якасцямі асобы, крытэрыі, параметры і паказчыкі яе развіцця.

2. Вызначаны сутнасць сацыякультурнай дзейнасці як самастойнай падсістэмы сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання, адукацыі і развіцця чалавека, яе структура і асноўныя функцыі.

3. Праведзена дыягностыка эстэтычнай накіраванасці студэнтаў культуралагічных і мастацкіх спецыяльнасцей, выяўлены іерархія матываў выбару імі прафесіі арганізатара сацыякультурнай дзейнасці і ўзроўні развіцця эстэтычнай накіраванасці.

4. Выяўлены сутнасць і роля эстэтычных інтарэсаў як формаў праяўлення і сродкаў фарміравання эстэтычнай накіраванасці асобы.

5. Распрацавана гіпатэтычная мадэль эстэтыка-выхаваўчага кампанента асобы педагога сацыякультурнай дзейнасці, вызначаны педагагічныя ўмовы яе рэалізацыі ў навучальным працэсе.

6. Вылучаны вядучыя кампаненты эстэтычнай накіраванасці асобы студэнта — крэатыўнасць, эмпатыя, эстэтычны тэзаўрус і педагагічны артыстызм, вызначаны педагагічныя ўмовы іх фарміравання ў працэсе падрыхтоўкі студэнта да арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці.

7. Раскрыты шляхі і сродкі фарміравання эстэтычнай накіраванасці асобы ў працэсе эстэтызацыі вучэбнай, мастацкай і самастойнай дзейнасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтваў.

8. Распрацаваны і ўкаранёны ў працэс падрыхтоўкі студэнтаў тыпавыя вучэбныя планы па спецыяльнасцях "культуралогія", "сацыяльная педагогіка", спецыялізацыях "арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці", "рэабілітацыя асобы сродкамі мастацтва".

Галоўным вынікам даследавання стала стварэнне новай мадэлі падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы культуры, заснаванай на спалучэнні грунтоўных культуралагічных ведаў, актыўнай эстэтыка-выхаваўчай работы па фарміраванні культурнага асяродка і далучэння студэнтаў да розных формаў сацыякультурнай дзейнасці на працягу ўсіх гадоў навучання ў вышэйшай навучальнай установе.

**Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў** забяспечваецца магчымасцю рэалізацыі прапанаваных канцэптуальных мадэляў у практыцы работы вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтваў, культуралагічных, сацыяльна-педагагічных і мастацкіх факультэтаў гуманітарных універсітэтаў, інстытутаў павышэння кваліфікацыі спецыялістаў сацыякультурнай сферы, што дае магчымасць эканоміі матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў у краіне.

Прапанаваныя аўтарам тыпалогія, характарыстыка эстэтычнай накіраванасці, крытэрыі і ўзроўні яе развіцця, умовы і шляхі фарміравання дазваляюць паглыбіць далейшую тэарэтычную распрацоўку праблем развіцця якасцей і ўласцівасцей асобы ў працэсе навучання і падрыхтоўкі студэнтаў да прафесійнай дзейнасці. Акрамя таго, прапанаваная методыка можа быць выкарыстана кіраўнікамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, спецыялізаваных мастацкіх школ, пазашкольных устаноў культуры пры стварэнні аўтарскіх сістэм эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення і дарослых, а таксама ў рабоце педагогаў розных ступеняў адукацыі, метадычных аб'яднанняў і арганізацый для пераасэнсавання і ўдасканалення арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці розных груп насельніцтва, вызначэння прыярытэтаў і шляхоў яе далейшага развіцця, распаўсюджвання сусветнага вопыту сацыякультурнай творчасці людзей. Гэта дазволіць знізіць затраты часу і фінансавых сродкаў для ўваходжання краіны ў еўрапейскую адукацыйную прастору.

Распрацаваныя матэрыялы сталі асновай стварэння і функцыянавання мадэлі культуралагічнай і мастацкай адукацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, падставай для вызначэння зместу

адукацыі (вучэбныя планы, дзяржаўныя стандарты, вучэбныя праграмы, кваліфікацыйныя характарыстыкі), сістэмы арганізацыі і кантролю за пазнавальнай дзейнасцю студэнтаў, канцэпцый мастацкай і выхаваўчай работы універсітэта.

Аўтарам створана і функцыянуе першая ў краіне кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, на якой больш за дванаццаць гадоў вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці, сацыяльнай педагогіцы і сацыяльнай рабоце (спецыялізацыя "рэабілітацыя асобы сродкамі мастацтва"), распрацаваны і ўкаранёны канцэпцыя і праграма падрыхтоўкі кадраў культуры для работы ў новых сацыяльна-эканамічных умовах.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Накіраванасць як псіхічная ўласцівасць асобы, найбольш істотная яе характарыстыка, вызначае дзейнасць асобы і выяўляецца ў гэтай дзейнасці, таму тыпізацыю накіраванасці па прадметна-змястоўных прыметах мэтазгодна ажыццяўляць на падставе дамінуючага віду дзейнасці, што дазваляе захаваць дынамічны бок накіраванасці як сістэмаўтваральнай функцыі і аб'яднаць на агульнай аснове вывучэнне такіх яе тыпаў, як пазнавальная, педагагічная, прафесійная, эстэтычная, творчая і інш.

2. Эстэтычная накіраванасць — гэта сукупнасць устойлівых матываў (матывацыйных комплексаў), якія арыентуюць дзейнасць асобы на ўспрыманне, спажыванне і стварэнне эстэтычных прадметаў, з'яў і каштоўнасцей. Рэалізацыя эстэтычнай накіраванасці як імкнення да максімальнай адпаведнасці формы жыццёвай з'явы ці прадмета іх прызначэнню або як адлюстравання патрэбнасці асобы ў гармоніі з навакольным асяроддзем мае вялікае значэнне для жыццядзейнасці чалавека, вызначаючы яе паспяховасць, камфортнасць, узровень і якасць вынікаў дзейнасці, адносіны да людзей і да сябе.

3. Эстэтычная накіраванасць асобы як сукупнасць устойлівых матываў вызначаецца наступнымі іх групамі: сацыяльныя, якія падзяляюцца на агульнасацыяльныя, альтруістычныя і камунікатыўныя; асабістыя, якія складаюцца з матываў самарэалізацыі, крэатыўных і прэстыжных; сітуатыўныя матывы, якія маюць слаба выражаны і выпадковы характар. Характарыстыкай узроўню эстэтычнай накіраванасці з'яўляюцца ўраўнаважаныя суадносіны сацыяльнай і асабістай матывацыі, наяўнасць дастатковага ўзроўню развіцця ўсіх параметраў і кампанентаў.

4. Для дыягностыкі ўзроўню развіцця эстэтычнай накіраванасці асобы студэнта вышэйшай навучальнай установы культуры і мастацтваў асноўнымі паказчыкамі з'яўляюцца матывы выбару прафесіі, задаволенасць ёю, устойлівасць эстэтычнай накіраванасці, ступень яе асэнсавання, адэкватнасць уяўленняў аб прафесіі, дзейснасць і гарманічнасць накіраванасці студэнта на эстэтыка-выхаваўчую дзейнасць. Паказчыкамі выс-

тупаюць працягласць цікавасці да прафесіі ў сферы культуры, час прыняцця канчатковага рашэння, адсутнасць хістанняў у яе выбары, здольнасць процістаяць адгаворам, індэкс устойлівасці выбару, наяўнасць вопыту ўдзелу ў сацыякультурнай дзейнасці, ступень асэнсавання станоўчых і адмоўных бакоў прафесіі, папярэдняя падрыхтоўка ў спецыяльных школах і профільных сярэднеспецыяльных навучальных установах.

5. Эстэтычныя інтарэсы як выбіральныя адносіны чалавека да эстэтычных прадметаў і з'яў рэчаіснасці з'яўляюцца формай праяўлення эстэтычнай накіраванасці асобы і асновай яе фарміравання. У сваім развіцці яны праходзяць тры асноўныя стадыі (узроўні). Першы ўзровень — станоўчыя адносіны да эстэтычна значымых аб'ектаў, пры якіх у поле зроку студэнта пападаюць знешнія характарыстыкі з'явы ці прадмета, уражлівыя, эмацыянальна прывабныя для чалавека дэталі. Другі ўзровень — пасіўны інтарэс, пад якім разумеюцца ўстойлівыя станоўчыя адносіны студэнта да эстэтычнага аб'екта, гатоўнасць да ўспрымання ведаў аб ім, але дзейнасць па авалоданні гэтымі ведамі адсутнічае. Трэці ўзровень — актыўны інтарэс — імкненне студэнта да паглыбленага вывучэння эстэтычнага аб'екта, актыўная дзейнасць па пошуку інфармацыі аб ім, выкарыстанне вольнага часу на яго ўспрыманне і любаванне. Пры спрыяльных умовах і мэтанакіраваным педагагічным уздзеянні трэці ўзровень пераходзіць у эстэтычную накіраванасць асобы.

6. Эстэтыка-выхаваўчая дзейнасць работніка культуры ёсць сістэма ўзаемазвязаных элементаў: арганізатарскага, развіццёвага, інфармацыйнага, канструктыўнага, камунікатыўнага, рэкрэацыйнага, арыентацыйнага, даследчага і інш., якія адначасова з'яўляюцца функцыянальнымі характарыстыкамі педагога сацыякультурнай дзейнасці. Мэтай эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці з'яўляецца адкрыццё для выхаванцаў прыгожых і ўзвышаных бакоў жыцця, прыроды, чалавека, працы, адносін паміж людзьмі — выяўленне эстэтычных аспектаў рэчаіснасці, цэласнай карціны хараства і гарманічнасці свету. Яна выступае адначасова сферай дзейнасці і сродкам дасягнення выніку, вырашаючы задачу эстэтычнага развіцця суб'екта сацыякультурнай дзейнасці, уплывае на фарміраванне яго асобы, інтэнсіфікуе інтэлектуальныя, эмацыянальныя і валявыя бакі псіхікі чалавека.

7. Аналіз дзейнасці педагога вольнага часу дазволіў выявіць эстэтыка-выхаваўчыя кампаненты яго асобы, сфарміраванасць якіх з'яўляецца ўмовай якаснага выканання прафесійнай работы. Гэта эстэтычная творчая актыўнасць, выяўленая ў крэатыўнасці; эмпатыя як здольнасць да педагагічных зносін на эстэтычным узроўні; педагагічны артыстызм як эстэтычная здольнасць прафесійнай самапрэзентацыі; эстэтычны тэзаўрус як наяўнасць неабходнай для рэалізацыі прафесійнай дзейнасці эстэтычнай адукаванасці і інтэлектуальна-эмацыянальнай выхаванасці. Гэтыя кампаненты асобы разглядаюцца намі як сфера праяўлення сутнасных сіл

педагога, як сродак гарманічнага функцыянавання ўсіх астатніх элементаў структуры асобы культработніка, выступаюць і як форма, і як механізм прафесійнай дзейнасці ў сацыякультурнай сферы.

8. Сацыякультурная адукацыя як вывучэнне, засваенне і ўзнаўленне сістэмнай сукупнасці духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам на працягу свайго развіцця, будуецца на іерархічнай структуры культуры, дзе асноўнымі ўзроўнямі з'яўляюцца духоўная, мастацкая і матэрыяльная культура, якія, у сваю чаргу, маюць уласныя, больш дробныя мікраструктуры. Для ахопу ўсіх элементаў гэтай складанейшай пабудовы неабходна разглядаць яе ў выглядзе цэласнай сістэмы, шматступеньчатага пірамідальнага ўтварэння, асновай якога служыць культура матэрыяльная, вяршыняй — духоўная культура і сярэднім слоем, сілкуючым крайнія полюсы, — мастацкая. У гэтым выпадку вывучэнне культуры рухаецца па асобных узроўнях яе пірамідальнай структуры, кожны з іх мае свае падструктуры з больш дробнымі ўласнымі ўзроўнямі, якім адпавядаюць галіновыя вучэбныя дысцыпліны.

9. Авалоданне зместам адукацыйных праграм павінна суправаджацца фарміраваннем уменняў і навыкаў, фармулёўкай асноўных мэт выконваемай працы, аналізам шляхоў іх дасягнення, практычнай дзейнасцю ў адной са сфер культуры. Асновай гэтага працэсу выступаюць фундаменталізацыя прадметных ведаў, стварэнне адукацыйных модуляў, азнаямленне са спосабамі і сродкамі рэалізацыі дзейнасці, якія дазваляюць студэнту перайсці ад абстрактных ведаў, прапануемых агульнагуманітарнымі дысцыплінамі, да канкрэтных прафесійных уменняў і навыкаў, што вызначаюць прадукцыйнасць прафесійнай дзейнасці. Такі падыход і далейшае развіццё асобы абумоўлены ўстойлівасцю матывацыі няспыннай пазнавальнай дзейнасці на працягу жыцця, прафесійнай накіраванасцю асобы, яе працавітасцю, адказнасцю, аб'ёмам самастойнай работы ў пазааўдыторны час.

**Асабісты ўклад суіскальніка.**

Дысертацыя ўяўляе сабой вынік шматгадовай працы па даследаванні праблемы фарміравання эстэтычных якасцей асобы. Спачатку гэта было вывучэнне зместу, метадаў і формаў эстэтычнага выхавання моладзі, затым — распрацоўка і эксперыментальная праверка мадэлі фарміравання эстэтычнай накіраванасці асобы ў працэсе яе падрыхтоўкі да прафесійнай дзейнасці ў сферы культуры.

У даследаванні выкарыстаны асабісты вопыт работы аўтара ў якасці настаўніка, навуковага супрацоўніка навукова-даследчага інстытута, выкладчыка вышэйшай школы, загадчыка кафедры, прарэктара па вучэбнай рабоце, рэктара універсітэта.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі** і ўкараненне іх у практыку ажыццяўляліся:

— прафесійнай і грамадскай ацэнкай шматлікіх публікацый аўтара, выданнем чатырнаццацці зборнікаў навуковых работ пад яго рэдакцыяй, прысвечаных праблемам эстэтычнага выхавання, вышэйшай культуралагічнай адукацыі, культуры і мастацтва Беларусі;

— шматкратным абмеркаваннем дакладаў аўтара ў Вучэбна-метадычным аб'яднанні вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтваў Расіі, на пасяджэннях камісіі па пытаннях культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, на пасяджэннях пастаяннай камісіі па сацыяльных пытаннях Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, на парламенцкіх слуханнях па падрыхтоўцы кадраў у сферы культуры;

— у працэсе абмеркавання асноўных палажэнняў і вынікаў даследавання на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях і сімпозіумах у гарадах Мінск (1975—2001), Тбілісі (1980), Фрунзе (1980), Магілёў (1982, 1985), Барнаул (1985), Рыга (1986), Нікалаеў (1987), Полацк (1987), Кіраваград (1988), Баранавічы (1989), Маладзечна (1991), Дэбрэцэн (1991), Чэлябінск (1992), Масква (1993, 1995), Далас (1995), Краснадар (1998), Санкт-Пецярбург (1997), Гавана (2001), Пекін (2001), а таксама на навуковых і метадычных канферэнцыях Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры;

— пры выкладанні курсаў лекцый па праблемах эстэтычнага выхавання ў Рэспубліканскім і Мінскім абласным інстытутах удасканалення настаўнікаў (1975—1990), выступленнях на семінарах і нарадах кіраўнікоў раённых, абласных і рэспубліканскіх органаў кіравання культурай;

— у шматлікіх выступленнях у перыядычным друку ("Культура", "Літаратура і мастацтва", "Маладосць", "Полымя", "Народная асвета", "Репетитор", "Сацыяльна-педагагічная работа", "Настаўніцкая газета", "7 дней", "Звязда", "Советская Белоруссия", "Народная газета", "Рэспубліка", "Чырвоная змена", "Знамя юности" і інш.

**Апублікаванасць вынікаў.**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання адлюстраваны ў звыш шасцідзесяці апублікаваных працах па тэме дысертацыі. Сярод іх 4 манаграфіі, 11 вучэбных дапаможнікаў і метадычных рэкамендацый, 21 артыкул у навуковых часопісах, зборніках, 28 матэрыялаў канферэнцый і тэзісаў дакладаў. Агульны аб'ём публікацый складае 1702 старонкі.

**Структура і аб'ём дысертацыі.**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, пяці глаў, заключэння, дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі 263 старонкі, з іх 19 — табліцы і малюнкі, 32 — дадаткі. Спіс выкарыстаных прац уключае 371 назву на беларускай, рускай, украінскай, англійскай, чэшскай і балгарскай мовах і займае 22 старонкі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Важнейшай падструктурай, ядром асобы з'яўляецца яе накіраванасць, асноўнымі кампанентамі якой выступаюць матывы і мэты ў арганічным спалучэнні адно з адным. Накіраванасць вызначаецца намі як псіхічная ўласцівасць асобы, вядучая, найбольш істотная яе характарыстыка, іерархічная сістэма сэнсаўтваральных матываў, якія вызначаюць дзейнасць асобы. Іншыя кампаненты ўваходзяць у накіраванасць і адпаведна характарызуюць яе ў той ступені, у якой яны выступаюць матывамі (інтарэсы, устаноўкі, схільнасці, жаданні, імкненні, патрэбнасці) або мэтамі (ідэалы) дзейнасці асобы [1, 26].

2. Эстэтычная накіраванасць ёсць сукупнасць устойлівых матываў (матывацыйных комплексаў), якія арыентуюць дзейнасць асобы на ўспрыманне, спажыванне і стварэнне эстэтычных прадметаў, з'яў і каштоўнасцей. Яна абумоўлівае развіццё іншых эстэтычных характарыстык асобы: пачуццяў, густаў, ацэнак, меркаванняў і выступае стрыжнёвым утварэннем эстэтычнай свядомасці асобы. Рэалізацыя эстэтычнай патрэбнасці як імкнення да максімальнай адпаведнасці формы жыццёвай з'явы ці прадмета іх прызначэнню або як адлюстраванне патрэбнасці ў гармоніі з навакольным светам мае вызначальнае значэнне для жыцця-

дзейнасці чалавека, абумоўліваючы яе паспяховасць, камфортнасць, узровень і якасць вынікаў дзейнасці, адносіны да людзей і сябе [1, 10, 26, 40, 43].

3. Вялікае значэнне набывае эстэтычная накіраванасць асобы пры падрыхтоўцы студэнтаў да сацыякультурнай дзейнасці, якая прадугледжвае арыентаваную на чалавека работу па выяўленні, асваенні, захаванні і трансляцыі культурных каштоўнасцей. Арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці як працэс стварэння ўмоў для матываванага выбару чалавекам прадметнай дзейнасці адпаведна яго інтарэсам і патрэбнасцям накіравана на сацыялізацыю асобы, камфортнае існаванне ў грамадстве, інкультурацыю, рэалізацыю сутнасных сіл і магчымасцей чалавека. Спецыфіка, мэты і сродкі іх дасягнення ў працэсе падрыхтоўкі да арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці выражаны ў сфармуляваных намі функцыях, уласцівых ёй: адаптацыйнай, развіццёвай, адукацыйнай, культураарыентуючай, культурастваральнай, культураахоўнай, рэкрэацыйна-аздараўленчай, камунікатыўнай [1, 2, 6, 8, 9, 16, 19, 20, 36, 48].

4. Эстэтычная накіраванасць асобы як сукупнасць устойлівых матывацыйных комплексаў можа быць дыягнаставана наяўнасцю класіфікаваных намі матываў: сацыяльных (агульнасацыяльныя, альтруістычныя і камунікатыўныя); асабістых (матывы самарэалізацыі, крэатыўнасці і прэстыжнасці); сітуатыўных, не маючых яркай выражанасці (выпадковых). Характарыстыкай узроўню прафесійнай эстэтычнай накіраванасці выступаюць гарманічныя суадносіны вядучых сацыяльных матываў з асабістымі пры нязначнай колькасці сітуатыўных. Даследаванне паказала дастаткова выражаную накіраванасць студэнтаў на прафесійную эстэтыка-выхаваўчую дзейнасць у сацыякультурнай сферы: часцей дамінуюць альтруістычныя і камунікатыўныя матывы (каля 65%) у спалучэнні з асабістымі матывамі самарэалізацыі, крэатыўнасці (каля 48%) пры адчувальнай наяўнасці агульнасацыяльнай матывацыі (каля 38%) [1, 2].

5. Эстэтычныя інтарэсы як выбіральныя адносіны чалавека да эстэтычных прадметаў і з'яў рэчаіснасці з'яўляюцца формай праяўлення эстэтычнай накіраванасці асобы і паказчыкам актыўнасці студэнтаў у падрыхтоўцы да будучай прафесійнай дзейнасці. Даследаванне зместу і ўзроўняў іх развіцця паказала прафесійную накіраванасць мастацкіх інтарэсаў, цесную ўзаемасувязь іх зместу з будучай прафесійнай дзейнасцю, якая і вызначае ў канчатковым выглядзе выбар любімых відаў мастацтва, змест чытацкіх патрэб, якасць перавагі пэўнага віду дзейнасці, формы заняткаў у вольны час, спецыфіку яго выкарыстання.

Недастатковая адпачынкавая кваліфікацыя апытаных, адсутнасць навыкаў і звычак правільнай арганізацыі і змястоўнага правядзення вольнага часу, адсутнасць увагі да гэтай праблемы з боку сям'і, школы, вышэйшых навучальных устаноў патрабуюць педагагічнага кіравання

арганізацыяй жыцця і дзейнасці студэнта праз дакладна прадуманую сістэму пазааўдыторнай дзейнасці, з аднаго боку, і развіцця ў студэнтаў патрэбнасці правільнага выкарыстання вольнага часу і ўмення яго рацыянальнага правядзення — з другога [1, 4, 13, 14, 19, 20, 24, 25, 34, 51, 53, 63, 64].

6. Эстэтыка-выхаваўчая дзейнасць педагога вольнага часу ўключае сістэму ўзаемазвязаных элементаў, аспектаў, кожнаму з іх адпавядаюць пэўныя педагагічныя функцыі і здольнасці. Гэта канструктыўны, арганізатарскі, камунікатыўны, інфармацыйны, развіццёвы, арыентацыйны, рэкрэацыйны, даследчы і іншыя аспекты, якія адначасова з'яўляюцца функцыянальнымі характарыстыкамі асобы выхавацеля. Мэтай эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці з'яўляюцца адкрыццё для выхаванцаў прыгожых і ўзвышаных бакоў жыцця, прыроды, чалавека, адносін людзей, выяўленне эстэтычных аспектаў рэчаіснасці, цэласнай карціны і гарманічнасці свету [1, 15, 21, 22, 23, 30, 31, 33, 44, 49, 50, 52].

7. Фарміраванне эстэтычнай накіраванасці студэнта вышэйшай навучальнай установы культуралагічнага і мастацкага профілю знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з узроўнем яго псіхалагічных і прафесійна-педагагічных якасцей, якія складаюць эстэтыка-выхаваўчы кампанент яго будучай прафесійнай дзейнасці. Да іх мы аднеслі найбольш важныя інтэгруючыя якасці, наяўнасць і ўзровень развіцця якіх з'яўляецца першаснай умовай эфектыўнасці эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці: эстэтычная творчая актыўнасць, выяўленая ў крэатыўнасці; эмпатыя як здольнасць да зносін на эстэтычным узроўні; педагагічны артыстызм як здольнасць да прафесійнай эстэтычнай самапрэзентацыі, эстэтычны тэзаўрус як наяўнасць неабходнага для рэалізацыі прафесійнай дзейнасці эстэтычнага багажу, запасу асобы, які ўключае эстэтычную адукаванасць і інтэлектуальна-эмацыянальную выхаванасць [1, 18, 21, 32, 45, 52].

8. Сацыякультурная адукацыя як вывучэнне, засваенне і ўзнаўленне сістэмнай сукупнасці духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам на працягу свайго развіцця, будуецца на іерархічнай структуры культуры, дзе асноўнымі ўзроўнямі з'яўляюцца духоўная, мастацкая і матэрыяльная культуры, якія, у сваю чаргу, маюць уласныя, больш дробныя мікраструктуры. Для ахопу ўсіх элементаў гэтай складанейшай пабудовы неабходна разглядаць яе ў выглядзе цэласнай сістэмы, шматступеньчатага пірамідальнага ўтварэння, асновай якога служыць культура матэрыяльная, вяршыняй — духоўная культура і сярэднім слоем, сілкуючым крайнія полюсы, — мастацкая. У гэтым выпадку вывучэнне культуры рухаецца па асобных узроўнях яе пірамідальнай структуры, кожны з якіх мае свае падструктуры з больш дробнымі ўласнымі ўзроўнямі, якім будуць адпавядаць галіновыя вучэбныя дысцыпліны. Прапанаваная намі сістэмная будова сацыякультурнай адукацыі дазваляе пераструктураваць прадметны змест навучання, унесці істотныя

змены ў вучэбныя планы і праграмы вышэйшай культуралагічнай адукацыі, перагледзець рэестр вучэбных дысцыплін і паслядоўнасць іх вывучэння, зняць унутраную таўталогію паміж вучэбнымі дысцыплінамі кожнага з пластоў культуры, сінхранізаваць вывучэнне розных відаў і элементаў культуры ў храналагічна выверанай паслядоўнасці [1, 2, 3, 5, 6, 10, 27, 28, 29, 37, 54, 55, 58, 59].

9.Авалоданне зместам адукацыйных праграм суправаждаецца фарміраваннем уменняў і навыкаў, фармулёўкай асноўных мэт выконваемай працы, аналізам шляхоў іх дасягнення, практычнай дзейнасцю ў адной са сфер культуры. Асновай гэтага працэсу выступаюць фундаменталізацыя прадметных ведаў, стварэнне адукацыйных модуляў, зняцце бар'ераў спецыялізацыі, азнаямленне са спосабамі і сродкамі рэалізацыі дзейнасці, якія дазваляюць студэнту перайсці ад абстрактных ведаў, прапануемых агульнагуманітарнымі дысцыплінамі, да канкрэтных прафесійных уменняў і навыкаў, якія вызначаюць прадукцыйнасць прафесійнай дзейнасці. Такі падыход і далейшае развіццё асобы абумоўлены ўстойлівасцю матывацыі няспыннай пазнавальнай дзейнасці на працягу далейшага жыцця, прафесійнай накіраванасцю асобы, яе працавітасцю, адказнасцю, аб'ёмам самастойнай работы ў пазаўдыторны час [1, 2, 3, 7, 11, 12, 17, 27, 29, 35, 37, 38, 39, 41, 42, 46, 47, 56, 57, 60, 61, 62].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


Манаграфіі

1. Грыгаровіч Я.Д. Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект / Бел. дзярж. ун-т культуры.– Мн., 2002.– 403 с.

2. Грыгаровіч Я.Д., Смолік А.І., Рагачова Л.М. Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы / Бел. дзярж. ун-т культуры.– Мн., 2001.– 158 с.

3. Григорович Я.Д., Игнатович П.Г., Карнажицкая Т.В. и др. Модель культурологического образования / Бел. гос. ун-т культуры.– Мн., 2000.– 180 с.– Деп. в БелИСА 13.06.2001 г., № Д200148 // Реф. сб. непубл. работ / ГК по науке и технологиям Респ. Беларусь, БелИСА. – Мн., 2001.– Вып. 2.– С. 87–88.

4. Григорович Я.Д. Живопись, графика...– Мн.: БелНИИНТИ, 1988. – 51 с.

Артыкулы ў часопісах і зборніках

5. Грыгаровіч Я.Д. Культура: паняцце, функцыянаванне, іерархія // Культура Беларусі: стан і перспектывы развіцця: Зб арт. / Бел. дзярж. ун-т культуры.– Мн., 2001.– С. 3–11.

6. Грыгаровіч Я.Д. Сацыякультурная дзейнасць: сутнасць, прынцыпы, функцыі // Сацыяльна-педагагічная работа.– 2001.– № 6.– С. 15–26.

7. Грыгаровіч Я.Д. Кадры культуры: праблемы і перспектывы іх падрыхтоўкі // Дзяржаўная нацыянальная праграма «Культура» і ўдасканаленне заканадаўчай базы галіны ў Рэспубліцы Беларусь / Нац. сход Рэсп. Беларусь. Палата прадстаўнікоў.– Мн., 1998.– С. 49–51.

8. Грыгаровіч Я.Д. На якой мове загаворым? // Полымя.– 1994.– № 4.– С. 150–158.

9. Grigorovich Ia. The Problem of Development of Social Pedagogic in Belarus // Teaching the theories.– Berlin, 1993.– P. 14–21.

10. Григорович Я.Д. Пути повышения художественной культуры студентов // Проблемы и пути формирования культуры студенческой молодежи: Сб. науч. тр.– Челябинск, 1992.– С. 107–120.

11. Грыгаровіч Я.Д. Спецыфіка арганізацыі самастойнай дзейнасці студэнтаў музычных спецыялізацый // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі: Рэсп. міжвед. зб. навук. прац. – Мн.: Вышэйшая школа, 1991. – Вып. 11. – С. 79–82.

12. Григорович Я.Д. Организация самостоятельной работы студентов художественных специализаций // Педагогика высшей и средней специальной школы: Межвед. сб. – Мн.: Университетское, 1989.– Вып. 3.– С. 24–29.

13. Григорович Я.Д. Анализ содержания и уровней развития художественных интересов студентов // Педагогика высшей и средней специальной школы: Межвед. сб. – Мн.: Университетское, 1988. – Вып. 2.– С. 92–100.

14. Григорович Я.Д. Фактическое использование студентами свободного времени // Педагогика высшей и средней специальной школы: Межвед. сб. – Мн.: Университетское, 1987. – Вып. 1.– С. 62–70.

15. Григорович Я.Д. Эстетическое воспитание средствами литературы // Эстетическое воспитание молодежи: Проблемы и опыт: Сб. ст. – Мн.: Народная асвета, 1986.– С. 79–83.

16. Грыгаровіч Я.Д. Выхаванне прыгажосцю // Маладосць. – 1986.– № 3.– С. 143–149.

17. Григорович Я.Д. Оптимизация самостоятельной учебной деятельности студентов // Педагогика высшей школы: Респ. межвед. сб. – Мн.: Университетское, 1984. – Вып. 8.– С. 93–95.

18. Григорович Я.Д. Формы приобщения подростков к литературно-творческой деятельности // Совершенствование форм и методов воспитания школьников: Сб. науч. тр. / НИИ педагогики МП БССР.– Мн., 1983.– С. 37–45.

19. Григорович Я.Д. Нравственные аспекты рационального использования свободного времени // Нравственное воспитание школьников в процессе внеклассной работы: Темат. сб. науч. тр. / НИИ педагогики МП БССР.– Мн., 1982.– С. 31–36.

20. Григорович Я.Д. Об изучении классным руководителем использования свободного времени старшеклассников // Вопросы коммунистического воспитания школьников: Темат. сб. науч. тр. / НИИ педагогики МП БССР.– Мн., 1981.– С. 56–62.

21. Григорович Я.Д. Пути совершенствования эстетического воспитания подростков // Коммунистическое воспитание детей и подростков: Науч.-реф. сб. / НИИ общ. педагогики АПН СССР.– М., 1981.– Вып. 5.– С. 8–9.

22. Григорович Я.Д. Пути повышения эстетико-воспитательной роли уроков литературы // Пути совершенствования эстетического воспитания подростков: Темат. сб. науч. тр. / НИИ педагогики МП БССР.– Мн., 1980.– С. 3–30.

23. Григорович Я.Д. Некоторые вопросы эстетического воспитания учащихся на уроках литературы // Пути совершенствования коммунистического воспитания учащихся: Темат. сб. науч. тр. / НИИ педагогики МП БССР.– Мн., 1978.– С. 123–129.

24. Григорович Я.Д. Некоторые вопросы изучения литературно-художественных интересов школьников // Теория эстетического воспитания школьников / НИИ общ. педагогики АПН СССР.– М., 1975.– С. 64–72.

25. Григорович Я.Д. Пути формирования литературно-художественных интересов на уроках литературы // Вопросы эстетического воспитания в школе: Сб науч. тр. / НИИ общих проблем воспитания АПН СССР.– М., 1974.– С. 17–26.

Матэрыялы канферэнцый і сімпозіумаў

26. Грыгаровіч Я.Д. Накіраванасць асобы як аб'ект навуковых даследаванняў // Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў: Матэрыялы навук. канф. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры.– Мн., 2000.– С. 3–12.

27. Грыгаровіч Я.Д. Асноўныя накірункі ўдасканалення культуралагічнай адукацыі // Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі: Матэрыялы навук. канф. аспірантаў (14 мая 1997 г.): У 2 ч. / Бел. ун-т культуры. – Мн., 1999. – Ч. 2. – С. 3–10.

28. Грыгаровіч Я.Д. Стандарты культуралагічнай адукацыі: значэнне, мэта, сэнс // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты: Матэрыялы навук.-метад. канф. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры.– Мн., 1999.– С. 3–6.

29. Грыгаровіч Я.Д. Сучасны стан і перспектывы развіцця культуралагічнай адукацыі // Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у арганізацыі дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў: Матэрыялы

навук.-метад. канф. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры. – Мн., 1998.– С. 3–8.

30. Григорович Я.Д. Особенности формирования духовной культуры сельских школьников // Современная специфика учебно-воспитательного процесса сельской школы / Пед. о-во БССР.– Молодечно, 1991.– С. 34–36.

31. Григорович Я.Д. Реализация идейно-воспитательного потенциала художественного произведения на уроках литературы // Комплексный подход к коммунистическому воспитанию молодежи: (Материалы респ. науч.-практ. конф.).– Мн.: Наука и техника, 1981.– С. 182–183.

32. Григорович Я.Д. Некоторые пути повышения эффективности эстетического воспитания подростков на уроках литературы // Проблемы теории и методики эстетического воспитания школьников: Материалы Всесоюз. симпозиума / НИИ пед. наук М-ва просвещения ГрССР, Пед. о-во ГрССР.– Тбилиси, 1980.– [Т.] 1.– С. 186–292.

33. Григорович Я.Д. Теоретические основы эстетического воспитания школьников // Пути и методы совершенствования коммунистического воспитания учащейся и студенческой молодежи: Материалы конф. / Мин. гос. пед. ин-т, НИИ педагогики МП БССР.– Мн., 1977.– С. 142–144.

34. Grigorowitsch Ia. Die Herausbildung von literaturisch-künstlerischen Interessen älterer Schüller in Unterrichtprocess // Materialen des VI Seminars der Aspiranten und jungen Gelehrten des APW UdSSR und APW der DDR.– Berlin, 1974.– B. 1.– S. 82–87.

Тэзісы дакладаў

35. Грыгаровіч Я.Д. Месца самастойнай работы ў структуры вучэбнай дзейнасці студэнтаў // Праблемы ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі: Тэз. дакл. на навук.-метад. канф. / М-ва культуры і друку Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры.– Мн., 1995.– С. 13–15.

36. Грыгаровіч Я.Д. Асноўныя накірункі дзейнасці сацыяльнага педагога // Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва: Тэз. дакл. на навук.-творчай канф. / М-ва культуры і друку Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры.– Мн., 1994.– С. 17–18.

37. Грыгаровіч Я.Д. Структурныя элементы сістэмы шматузроўневай адукацыі // Прафесіяналізм выкладчыкаў універсітэта ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі: Тэз. дакл. на навук.-метад. канф. / М-ва культуры і друку Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры.– Мн., 1994.– С. 3–4.

38. Сістэмы дакладных ведаў у мове, мастацтве і канструяванні / А.Бураўкін, С.Новікава, Я.Грыгаровіч і інш. // Нацыянальная культура як аснова зместу навучання і выхавання студэнтаў: Тэз. дакл. міжнар.

навук.-метад. канф. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры.– Мн., 1993.– Ч. 2.– С. 47–48.

39. Grigorovich Ia. The Producing of social workers in the East-Western college // Teaching the theories.– Berlin, 1993.– P. 3–4.

40. Григорович Я.Д. Анализ направленности художественных интересов студентов // Вопросы теории и практики культурно-просветительной работы: Тез. докл. на конф. / Мин. ин-т культуры.– Мн., 1991.– С. 13–16.

41. Григорович Я.Д. Пути активизации познавательной деятельности студентов // Использование активных методов обучения будущих специалистов в области культуры: Сб. тез. докл. / М-во культуры БССР, Мин. ин-т культуры.– Мн., 1990.– С. 61–62.

42. Григорович Я.Д. Опыт организации самостоятельной работы студентов художественных специализаций // Актуальные проблемы подготовки кадров в области искусства и культуры в свете перестройки высшего и среднего специального образования: Тез. докл. респ. науч.-теорет. конф. / Киев. гос. ин-т культуры.– Николаев, 1988.– Секция 2: Культ.-просвет. работа.– С. 83–84.

43. Григорович Я.Д. Характеристика направленности художественных интересов студентов // Эстетическое воспитание учащейся молодежи – задачи, теория, практика, перспективы: Тез. Всесоюз. науч.-практ. семинара.– Кировоград, 1988.– С. 35–36.

44. Григорович Я.Д., Чернышова Л.В. Использование педагогических принципов А.С. Макаренко в эстетическом развитии личности студента // А.С.Макаренко и современность: (Тез. докл. на респ. конф., посвящ. 100-летию со дня рождения выдающегося советского педагога) / Пед. о-во БССР.– Мн., 1988.– С. 131–133.

45. Григорович Я.Д. Пути совершенствования эстетического воспитания студентов // Актуальные проблемы эстетики и эстетического воспитания в свете решений XXVII съезда КПСС: (Тез. докл. и выступлений), Полоцк–Новополоцк, 24–26 сент. 1987 г.: [В 2 ч.] / М-во просвещения БССР, М-во культуры БССР, Пед. о-во БССР.– Мн., 1987.– Ч. 2.– С. 372–375.

46. Григорович Я.Д. Пути активизации самостоятельной учебной деятельности студентов // Актуальные проблемы педагогики высшей школы: Тез. докл. и сообщ. II респ. науч.-метод. конф. / М-во высш. и ср. спец. образования БССР, Бел. гос. ун-т им. В.И. Ленина.– Мн., 1986.– С. 20–21.

47. Григорович Я.Д. Опыт исследования самостоятельной учебной деятельности студентов // Изучение, пропаганда и внедрение передового опыта в вузах культуры: Тез. докл. к всесоюз. конф. / Алтайск. гос. ин-т культуры.– Барнаул, 1985.– Ч. 1.– С. 36–38.

48. Григорович Я.Д. Эстетическое воспитание детей в сельской семье // Психолого-педагогические проблемы семейного воспитания: (Тез. докл. и выступлений) : [В 4 ч.].– Могилев, 1985.– Ч. 2.– С. 225–228.

49. Григорович Я.Д. К вопросу о сущности эстетического воспитания учащихся на уроках литературы // Актуальные проблемы эстетического воспитания детей и молодежи: Тез. докл. респ. науч.-практ. конф.: [В 2 ч.] / ЦК ЛКСМБ, М-во просвещения БССР, М-во высш. и ср. спец. образования БССР.– Могилев, 1982.– Ч. 1.– С. 80–82.

50. Григорович Я.Д. Пути реализации эстетико-воспитательных возможностей литературы // Тезисы III республиканской научной конференции по эстетическому воспитанию детей и молодежи / НИИ педагогики М-ва просвещения КиргССР.– Фрунзе, 1980.– С. 7–8.

51. Григорович Я.Д. Психолого-педагогические предпосылки формирования интереса старшеклассников к художественной литературе // Педагогические аспекты социальной психологии: Тез. респ. науч.-теорет. конф. / Пед. о-во БССР, НИИ педагогики М-ва просвещения БССР.– Мн., 1978.– С. 85–86.

52. Григорович Я.Д. Активизация творческой деятельности старшеклассников при изучении поэзии // Взаимосвязь теории и практики эстетического воспитания школьников: (Тез. докл. Всесоюз. науч.-практ. конф.) / НИИ худож. воспитания АПН СССР.– М., 1977.– С. 155–157.

53. Григорович Я.Д. Изучение биографии поэта как основа формирования интереса к его творчеству // Эстетическое воспитание в условиях развитого социалистического общества: Тез. докл. к IV симпозиуму по эстет. воспитанию / Пед. о-во РСФСР, НИИ худож. воспитания АПН СССР.– М., 1975.– С. 152–154.

Вучэбна-метадычныя дапаможнікі, рэкамендацыі

54. Педагогіка: Праграма для ВНУ культуры і мастацтва / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры; [Распрац.: Я.Д.Грыгаровіч, В.А.Грачова, Л.М.Рагачова].– Мн., 1996.– 22 с.

55. Грыгаровіч Я.Д., Марозава Л.І. Метадычныя ўказанні і кантрольныя заданні для слухачоў завочных падрыхтоўчых курсаў па спецыяльнасці «сацыяльная педагогіка» / Мін. ін-т культуры.– Мн., 1992.– 7 с.

56. Григорович Я.Д. Организация самостоятельной работы студентов института культуры: (Учеб.-метод. пособие). Ч. 2 / Мин. ин-т культуры.– Мн., 1992.– 54 с.

57. Григорович Я.Д. Организация самостоятельной работы студентов института культуры: (Учеб.-метод. пособие). Ч. 1 / Мин. ин-т культуры.– Мн., 1991.– 70 с.

58. Григорович Я.Д. Методические рекомендации для поступающих на специальность «социальная педагогика» / Мин. ин-т культуры.– Мн., 1991.– 8 с.

59. Грыгаровіч Я.Д., Марозава Л.І. Метадычныя ўказанні да ўступнага экзамену па спец. 13.00.05 / Мін. ін-т культуры.– Мн., 1991.– 10 с.

60. Григорович Я.Д. Педагогическое руководство самостоятельной работой студентов / М-во культуры БССР, Мин. ин-т культуры.– Мн., 1990.– 30 с.

61. Григорович Я.Д. Самостоятельная работа по педагогике / Мин. ин-т культуры.– Мн., 1986.– 18 с.

62. Григорович Я.Д., Овдей С.В. Реформа общеобразовательной и профессиональной школы как условие дальнейшего совершенствования системы народного образования в СССР: (Метод. материалы по педагогике) / Мин. ин-т культуры.– Мн., 1985.– 22 с.

63. Григорович Я.Д. Школьная дискотека: Метод. рекомендации / М-во просвещения БССР.– Мн., 1981.– 9 с.

64. Григорович Я.Д., Мицура Т.Д. Клуб выходного дня: Метод. рекомендации / Мингорисполком.– Мн., 1981.– 18 с.

Навуковыя зборнікі пад рэдакцыяй дысертанта

1. Культура Беларусі: стан і перспектывы развіцця: Зб. арт. / Бел. дзярж. ун-т культуры; Пад рэд. Я.Д.Грыгаровіч, П.Р.Ігнатовіча.– Мн., 2001.– 251 с.

2. Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты: Матэрыялы навук.-метад. канф. (2–3 лют. 1999 г.) / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры; [Рэд. кал.: Я.Д.Грыгаровіч і інш.].– Мн., 1999.–194 с.

3. Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць: Тэз. дакл. на навук. канф. (18–19 крас. 1996 г.) / Бел. ун-т культуры; [Рэд. кал.: Я.Д.Грыгаровіч і інш.].– Мн., 1997.– 162 с.

4. Пытанні культуры і мастацтва Беларусі: Рэсп. міжвед. зб. навук. прац. Вып 13. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. ун-т культуры, Бел. акад. музыкі; [Рэд. кал.: Я.Д.Грыгаровіч (гал. рэд.) і інш.].– Мн.: Выш. шк., 1994.– 160 с.

5. Пытанні культуры і мастацтва Беларусі: Рэсп. міжвед. зб. навук. прац. Вып 12. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Мін. ін-т культуры; [Рэд. кал.: Я.Д.Грыгаровіч (гал. рэд.) і інш.].– Мн.: Выш. шк., 1993.– 168 с.

6. Вопросы культуры и искусства Белоруссии: Респ. межвед. сб. науч. тр. Вып. 10 / Мин. ин-т культуры; [Ред. кол.: Н.Н.Заренок, К.И.Степанцевич, Я.Д.Григорович и др.].– Мн.: Выш. шк., 1991.– 84 с.

7. А.С.Макаренко и современность: (Тез. докл. на респ. конф., посвящ. 100-летию со дня рождения выдающегося советского педагога) /

Пед. о-во БССР. Респ. совет; [Ред. кол.: Н.А.Березовин, Д.И.Водзинский, Я.Д.Григорович и др.].– Мн., 1988.– 420 с.

8. Актуальные проблемы эстетики и эстетического воспитания в свете решений XXVII съезда КПСС: (Тез. докл. и выступлений), Полоцк–Новополоцк, 24–26 сент. 1987 г.: [В 2 ч.] / М-во просвещения БССР, М-во культуры БССР, Пед. о-во БССР; [Ред. кол.: В.А.Салеев, О.О.Грачева, Я.Д.Григорович и др.] .– [Мн.], 1987.– Ч. 1.– 224 с.; Ч. 2.– 516 с.

9. Эстетическое воспитание молодежи: Проблемы и опыт: [Сб. ст.] / Респ. совет Пед. о-ва БССР; [Ред. кол.: В.А.Салеев (гл. ред.), М.М.Герасимович, О.О.Грачева, Я.Д.Григорович и др.].– Мн., 1986.– 127 с.

10. Совершенствование форм и методов воспитания школьников: Сб. науч. тр. / НИИ педагогики МП БССР; [Под ред. Н.Г.Огурцова, Я.Д.Григорович].– Мн.: НИИ педагогики МП БССР, 1983.– 87 с.

11. Нравственное воспитание школьников в процессе внеклассной работы: Темат. сб. науч. тр. / НИИ педагогики; [Под ред. В.Г.Сенько, Я.Д.Григорович].– Мн.: НИИ педагогики МП БССР, 1982.– 94 с.

12. Вопросы коммунистического воспитания школьников: Темат. сб. науч. тр. / М-во просвещения БССР, НИИ педагогики; [Ред. кол.: Н.Г.Огурцов, Я.Д.Григорович, В.Г.Сенько].– Мн., 1981.– 87 с.

13. Пути совершенствования эстетического воспитания подростков: Темат. сб. науч. тр. / НИИ педагогики МП БССР; [Под ред. В.В.Ивашина, Я.Д.Григорович].– Мн.: НИИ педагогики МП БССР, 1980.– 110 с.

14. Пути и методы совершенствования коммунистического воспитания учащейся и студенческой молодежи: Материалы конф. / М-во просвещения БССР, Мин. гос. пед. ин-т, НИИ педагогики МП БССР; [Ред. совет: А.Т.Короткевич (гл. ред.), В.В.Ивашин, М.С.Цедрик, Н.Г.Огурцов, Я.Д.Григорович и др.].– Мн., 1977.– 249 с.



# РЭЗЮМЭ

**Грыгаровіч Ядвіга Дамінікаўна**

**Фарміраванне эстэтычнай накіраванасці студэнтаў у працэсе падрыхтоўкі да прафесійнай сацыякультурнай дзейнасці**

**Ключавыя словы:** эстэтычная накіраванасць, асоба студэнта, матывацыя, тыпалогія, сацыякультурная дзейнасць, функцыі, культуралагічная адукацыя, тэарэтычная мадэль, фарміраванне, змест, метады, формы, узроўні, крытэрыі.

**Аб'ект даследавання:** эстэтычная накіраванасць асобы студэнта вышэйшай навучальнай установы культуры і мастацтваў як сістэмаўтваральная, прафесійна вызначальная якасць будучага арганізатара сацыякультурнай дзейнасці.

**Прадмет даследавання:** умовы, шляхі і сродкі фарміравання эстэтычнай накіраванасці асобы студэнта ў працэсе падрыхтоўкі да прафесійнай дзейнасці ў сферы культуры.

**Мэтай** дысертацыйнага даследавання з'яўляецца распрацоўка тэарэтычных асноў фарміравання эстэтычнай накіраванасці асобы студэнта вышэйшай навучальнай установы культуры і мастацтваў, шляхоў і сродкаў іх рэалізацыі ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі да арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці насельніцтва.

У рабоце выкарыстана сукупнасць метадаў параўнальна-гістарычнага, культуралагічнага, мастацтвазнаўчага, сацыялагічнага, псіхалагічнага і педагагічнага аналізу, розных мадыфікацый эмпірычных і эксперыментальных метадаў даследавання, а таксама спецыфічных спосабаў вывучэння эстэтыка-выхаваўчых якасцей асобы. Упершыню ў педагагічнай навуцы распрацаваны тэарэтычныя асновы фарміравання эстэтычнай накіраванасці студэнта, гіпатэтычная мадэль эстэтыка-выхаваўчага кампанента асобы педагога сацыякультурнай дзейнасці, вызначаны педагагічныя ўмовы, шляхі і сродкі яе рэалізацыі ў працэсе навучання.

Распрацаваныя матэрыялы сталі асновай стварэння і функцыянавання мадэлі культуралагічнай адукацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, падставай для вызначэння зместу адукацыі (вучэбныя планы, дзяржаўныя стандарты, вучэбныя праграмы, кваліфікацыйныя характарыстыкі), сістэмы арганізацыі і кантролю за пазнавальнай дзейнасцю студэнтаў, стварэння канцэпцый мастацкай і выхаваўчай работы ў вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтваў.

Прапанаваныя аўтарам тэарэтычная мадэль эстэтычнай накіраванасці, крытэрыі і ўзроўні яе развіцця, умовы і шляхі фарміравання дазваляюць паглыбіць далейшую распрацоўку праблем развіцця якасцей і ўласцівасцей асобы ў працэсе навучання і падрыхтоўкі студэнтаў да прафесійнай дзейнасці.

# РЕЗЮМЕ

## Григорович Ядвига Доминиковна

## Формирование эстетической направленности студентов в процессе подготовки к профессиональной социокультурной деятельности

**Ключевые слова:** эстетическая направленность, личность студента, мотивация, типология, социокультурная деятельность, функции, культурологическое образование, теоретическая модель, формирование, содержание, методы, формы, уровни, критерии.

**Объект исследования:** эстетическая направленность личности студента высшего учебного заведения культуры и искусств как системообразующее, профессионально определяющее качество будущего организатора социокультурной деятельности.

**Предмет исследования:** условия, пути и средства формирования эстетической направленности личности студента в процессе подготовки к профессиональной деятельности в сфере культуры.

**Целью** диссертационного исследования является разработка теоретических основ формирования эстетической направленности личности студента высшего учебного заведения культуры и искусств, путей и средств их реализации в процессе профессиональной подготовки к организации социокультурной деятельности населения.

В работе использована совокупность методов сравнительно-исторического, культурологического, искусствоведческого, социологического, психологического и педагогического анализа, различных модификаций эмпирических и экспериментальных методов исследования, а также специфических способов изучения эстетико-воспитательных качеств личности. Впервые в педагогической науке разработаны теоретические основы формирования эстетической направленности студента, гипотетическая модель эстетико-воспитательного компонента личности педагога социокультурной деятельности, определены педагогические условия, пути и средства ее реализации в процессе обучения.

Разработанные материалы стали основой создания и функционирования модели культурологического образования в Белорусском государственном университете культуры, определение содержания образования (учебные планы, государственные стандарты, учебные программы, квалификационные характеристики), системы организации познавательной деятельности студентов и контроля за ней, создания концепций художественной и воспитательной работы в высших учебных заведениях культуры и искусств.

Предложенные автором теоретическая модель эстетической направленности, критерии и уровни ее развития, условия и пути формирования позволяют углубить дальнейшую разработку проблем развития качеств и свойств личности в процессе обучения и подготовки студентов к профессиональной деятельности.

## SUMMARY

**Grigorovich Yadviga Dominikovna**

**The Formation of Students' Aesthetic Orientation in the Process of Training for Professional Social Cultural Activity**

**Key words:** aesthetic orientation, the personality of a student, motivation, typology, social cultural activity, functions, cultural education, theoretical model, formation, content, methods, forms, levels, criteria.

**The object-research:** the aesthetic orientation of a student's personality at a higher educational establishment of culture and art as the system-creating professional determining quality for a future organizer of social cultural activities.

**The subject of research:** conditions, ways and methods of the formation of a student's personality in the process of training for professional activity in the cultural sphere.

**The thesis aims** at elaborating a theoretical basis for the formation of aesthetic orientation of a student's personality at a higher educational establishment of culture and art, ways and methods of their realization during a professional training for the organization of people's social cultural activity.

In our research a totality of methods has been used: comparative historical, cultural, creative, sociological, psychological and pedagogical analysis, different modifications of empiric and experimental methods of research as well as specific means of exploring a person's aesthetic educational qualities. For the first time in pedagogic science there have been worked out theoretical foundations for the formation of a student's aesthetic orientation, a hypothetical model of aesthetic educational component for a teacher's personality of social cultural activity, pedagogic conditions, ways and methods of its realization in the process of teaching.

The results obtained have founded a basis for the creation and functioning of a cultural educational model at the Belarusian State University of Culture, for working out the form and content of education (curricula, State standards, syllabi, testimonials), systems of organization and control for students' cognitive activity, creation of conceptions for artistic and educational work at higher schools of culture and art.

The proposed theoretical model of aesthetic orientation, criteria and levels of its development, conditions and ways of its formation permit to delve deeply into the further working out of problems for the development of a person's qualities and features in the process of teaching and training students for professional activity.

Навуковае выданне

**Грыгаровіч Ядвіга Дамінікаўна**

**ФАРМІРАВАННЕ ЭСТЭТЫЧНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПРАФЕСІЙНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара педагагічных навук

Падп. у друк 18.04.2002 г. Фармат 60х84 1/16. Папера пісчая № 2.
Ум. друк.арк. 2,44. Ул.-выд.арк. 2,6. Тыр. 120 экз. Зак. 111.

Рызограф Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры.
220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.